Паэтычны пленэр

## У анталогію сядзібы М. К. Агінскага

***З розных куткоў нашай Бацькаўшчыны прагныя да літаратурнага слова госці зляцеліся на паэтычны пленэр, прысвечаны М. К. Агінскаму, у Залескі музей-сядзібу.***

Раней за ўсіх прыйшлі па вільготным снезе ажно з самай чыгуначнай станцыі некалькі старшакласнікаў са Смаргонскай гімназіі ў суправаджэнні кіраўніка вучнёўскага навуковага таварыства Таццяны Буйноўскай і дырэктара народнага музея Ларысы Рогач. Прайшліся сабе па музеі і прыселі ў мяккія крэслы канцэртнай залы.




Праз некалькі хвілін пад’ехалі вядомыя смаргонскія аўтары, якія ўжо не аднойчы пісалі пра сядзібу Агінскага: паэт і ганаровы грамадзянін Смаргонскага раёна Мар'ян Дукса, аўтар урачыстага верша на адкрыццё музея М. К. Агінскага і лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі, папулярны паэт, кампазітар і выканаўца ўласных песень Алег Мізула з Жодзішак, паэтэса і журналіст, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Ала Клемянок і аўтар шматлікіх краязнаўчых публікацый Уладзімір Прыхач. Услед за імі насыпаўся поўны вестыбюль залескіх школьнікаў з творчым

кіраўніком школьнай літаратурнай суполкі настаўніцай беларускай мовы Наталляй Сідаравай і настаўніцай англійскай мовы Аленай Канапацкай. І, нарэшце, прыехалі чаканыя госці з Мінска і Маладзечна: былы рэдактар жаночага часопіса "Алеся" Тамара Бунта з сяброўкамі па Саюзу пісьменнікаў Беларусі маладзечанскімі пісьменніцамі Лідзіяй Гардынец, Тамарай Бярэзінай і перакладчыцай Тамарай Аўсяннікавай.



Сустрэча пачалася з асабістага знаёмства, якое ў многіх удзельнікаў было дасюль віртуальным, а нарэшце, зрабілася рэальным, і з экскурсіі па музею. У тэатральна-музычнай зале пачалася дзея: паглыбленне ў гісторыю культурнага жыцця Віленскага краю, а менавіта арыстакратычных сядзіб у Залессі і Дабраўлянах, таму што менавіта гэтыя сядзібы былі культурнымі цэнтрамі краю, а вядучыя імпрэзы дзве родныя сястры - Габрыеля Пузына (навуковы супрацоўнік музея Таццяна Кляшчонак) і Матыльда Бучынская (паэтка Ала Клемянок), прычым абедзьве - не інакш як графіні з дому Адама Гюнтара, вельмі наглядна прадставілі панараму залескай сядзібы ў паэтычным асвятленні сваіх землякоў за апошнія 200 год. Успомнілі, што гэтым летам спаўняецца 195 год напісання паэмы “Залессе” віленскім паэтам Аляксандрам Ходзькам. Адзначылі ўплыў на паэтычную творчасць краю Адама Міцкевіча і даведаліся пра сувязь дабраўлянскай жыхароў з самім Міцкевічам.



Затым папрасілі барда Алега Мізулу зрабіць музычны акцэнт сказанаму яго песняй “Я іду зямлёй Віленскаю...”. Свае творы, прысвечаныя спадчыне Міхала Клеафаса Агінскага прачыталі Мар’ян Дукса, Тамара Бунто, Ала Клемянок. Затым слова бралі прысутныя юныя таленты. Парадавалі згустоўнымі літаратурнымі спробамі Марыя Мікіціна, Насця Ліс, Улад Нясцюрын, Ангеліна Кенька, Паліна Марыніна з Залескай СШ. Цікавыя паэтычныя радкі прачыталі гімназісты: Вікторыя Новік, Ангеліна Гакуць, Ганна Мізула, Вікторыя Шапель, Аляксандра Ганчарык, Аляксей Лагута, Дзяніс Рыжанкоў.

За сталамі, упрыгожанымі стылізаваным посудам, філіжанкамі і сподачкамі з геральдычнымі сімваламі, смакуючы гарбату і печыва, госці працягвалі чытаць вершы, трыялеты, спяваць песні. Шмат прыемных уражанняў ад мерапрыемства і сціплыя падарункі ад рэдакцыі газеты “Светлы шлях” атрымалі ўсе прысутныя.

**Таццяна ІВАНОВА.**

**Фота Святланы КЕНЬКА.**